**А. М. Кушнярэвіч, В. В. Навумава**

# ГЕРМАНСКІЯ ЎПЛЫВЫ Ў ДЭКАРАТЫЎНА-ЎЖЫТКОВЫМ МАСТАЦТВЕ БЕЛАРУСІ XVIII ст.

У магнацкіх і багатых шляхецкіх рэзідэнцыях, якія сталі цэнтрамі еўрапейскай культуры ў XVIII ст., праяўляецца вялікая цікавасць да паслуг замежных архітэктараў, мастакоў і майстроў, каб з іх дапамогай весці актыўнае палацава-сядзібнае будаўніцтва. Новае архітэктурнае асяроддзе патрабавала свайго напаўнення ў выглядзе твораў выяўленчага і дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва. Таму ў першай палове XVIII ст. Радзівілы заснавалі на землях уласных вотчынных маёнткаў шэраг мануфактур па вытворчасці мастацкіх вырабаў, арыентуючыся на тэхнічна-тэхналагічныя ўзоры еўрапейскіх прафесіяналаў. Так, як мецэнат Ганна Кацярына Радзівіл (Сангушка) фінансавала славутыя мануфактуры шкла і люстэркаў у Налібоках (Стаўбцоўскі раён) і Урэччы (Любанскі раён). Для арганізацыі вытворчасці яна запрасіла майстроў з розных замежных краін. Сярод іх было даволі шмат выхадцаў з германскіх земляў. Ва Урэччы шкляной мануфактурай кіраваў нямецкі майстар Ян Фрэдэрык Бахстрэм. Арганізатарам вытворчасці на Налібоцкай шкляной мануфактуры быў адмысловец з Саксоніі Канстанцін Фрэмель.

Замежныя адмыслоўцы таксама вызначылі характар, тэматыку і мастацкія асаблівасці форм і дэкору беларускага шкла. Так, з 1728 г. нямецкі майстар Дрэгер пачаў аздабляць па ўзорах берлінска-патсдамскай шкляной мануфактуры ўрэцка-налібоцкі посуд працаёмкай і ў мастацкіх адносінах вельмі каштоўнай тэхнікай рэльефнай разьбы па шкле, якой вучыў беларускіх майстроў. У спісах адмыслоўцаў па шкле (гутнікаў) фігуруюць Вольф Ландграф, Каспар Вагнер, Іаган Грайнер, якія мяркуючы па прозвішчах, былі немцамі. З нямецкага шкларобства была запазычана і форма асобных вырабаў: усечанага конуса і інш.

З цягам часу беларускія майстры ўдасканалілі гэту тэхніку, паглыбіўшы разьбу. Адначасова налібоцкія гравіроўшчыкі асвоілі такі від аздобы берлінска-патсдамскай мануфактуры, як упрыгожванне посуду шклянымі барэльефнымі медальёнамі – камеямі ў тэхніцы разьбы па шкле. Акрамя таго, карысталіся яшчэ дзвюма тэхнікамі аздобы – наклейваннем у адпаведнае паглыбленне плоскіх, папярэдне адлітых медальёнаў з бясколернага і чырвонага (рубінавага) шкла.

Выраб рубінавага шкла, напэўна, наладзілі саксонскія адмыслоўцы – браты Ян і Генрых Генсы і Дрэгер. Распісваў золатам рубінавыя і бясколерныя медальёны, адлітыя ў формах, мастак Ян Фрыдрых Дзіц. Гэты мастак укараніў на мануфактуры ва Урэччы шырока распаўсюджаную ў Заходняй Еўропе тэхніку міжсценнага залачэння і роспіс золатам шкляных вырабаў. Каля сярэдзіны XVIII ст. немцам Вольфам Ландграфам на гэтай мануфактуры быў наладжаны выпуск асабліва тонкага мастацкага крышталю – так званага багемскага.

Тэматыку гравіравальных кампазіцый беларускага шкла першай паловы XVIII ст. вызначалі саксонскія адмыслоўцы, якія працавалі да 40-х гг. на Налібоцкай мануфактуры разам з Мікалаем і Янам Дубіцкімі, Рыгорам Аўчуком. Для гэтага Ганна Радзівіл ў 1724 г. запрасіла сюды яшчэ аднаго прафесіянала – немца К.Ф. Фрэмеля, які кіраваў гравёрнай і шклоскульптурнай майстэрнямі. У тэматыцы вырабаў гэтага часу пераважаюць урачыстапарадныя партрэты, міфалагічныя, алегарычныя і паляўнічыя сцэны, краявіды і гербы. Засвоіўшы тэхнічныя прыёмы нямецкіх шкларобаў і мясцовых майстроў залатой і срэбнай справы, гравіроўшчыкі, шліфоўшчыкі ў Налібоках і Урэччы затым перадавалі іх ад аднаго пакалення мастакоў да другого – Дубіцкіх, Рымашэўскіх, Залескіх, Станцэвічаў, Адамовічаў, Александровічаў, Дашкевічаў і інш.

Асаблівую славу ўрэцка-налібоцкім мануфактурам прынеслі люстэркі і розныя віды асвятляльных прыбораў. На Урэцкай мануфактуры заходнееўрапейскія ўзоры люстэркаў (багемскія, французскія і англійскія) укараніў у вытворчасць запрошаны з Германіі майстар Х. Т. Шэрбер, які кіраваў люстэркавай вытворчасцю ў 1739–1765 гг. Увогуле гэта была першая ва ўсёй Рэчы Паспалітай люстэркавая мануфактура, якая ўзнікла, калі ў Еўропе распаўсюдзілася мода на аздабленне пакояў магнацкіх палацаў і шляхецкіх сядзіб у стылі ракако люстэркавымі галерэямі і люстэркавымі кабінетамі. Тым самым Ганна Радзівіл задаволіла попыт з дапамогай нямецкіх майстроў на гэтыя творы мастацкага шкла ва ўсёй Рэчы Паспалітай. Па тэхнічнаму і мастацкаму ўзроўню выканання вырабы шкляных мануфактур ва Урэччы і Налібоках, якімі ўпрыгожваліся шматлікія палацы Радзівілаў, а таксама замкі і сядзібы іншых магнатаў, былі аналагічна французскім, англійскім, багемскім.

Намаганнямі Радзівілаў, якія запрасілі для арганізацыі вытворчасці кваліфікаваных адмыслоўцаў з Германіі, шкляныя мануфактуры ва Урэччы і Налібоках сталі ў адзін шэраг з аналагічнымі прадпрыемствамі ў Еўропе. Тэматыку гравіраваных кампазіцый беларускага шкла першай паловы XVIII ст. вызначалі саксонскія адмыслоўцы, якія працавалі ў той час у Налібоцкай мануфактуры разам з беларускімі майстрамі. Тэматыка вырабаў звязана з выявай парадных партрэтаў, міфалагічных, алегарычных і паляўнічых сцэн, а таксама радавых гербаў. У шкларобстве Беларусі таго часу знайшлі адлюстраванне такія агульнаеўрапейскія мастацкія стылі, як барока, ракако, класіцызм.

Урэцка-налібоцкае шкло займае ў еўрапейскім шкларобстве самастойнае месца, бо, нягледзечы на вялікую нівеліроўку форм і дэкору, якая ўтварылася ў выніку распаўсюджвання вышэй адзначаных мастацкіх стыляў на прадукцыю шкла ўсіх краін, а таксама непасрэдны ўдзел у вытворчым працэсе іншаземных адмыслоўцаў, беларускія майстры змаглі надаць урэцка-налібоцкаму шклу самабытныя мясцовыя рысы, якія вылучаюць яго з калекцыі заходнееўрапейскага і рускага шкла.

Нямецкія майстры былі задзейнічаны і на фаянсавай мануфактуры Радзівілаў у мястэчку Свержань (зараз Новы Свержань, Стаўбцоўскі раён), якая была заснавана ў 1742 г. ваяводам Віленскім, гетманам ВКЛ Міхаілам Казімі-

рам Радзівілам (Рыбанька). Праіснавала не менш за 20 гадоў і спыніла працу ў хуткім часе пасля смерці заснавальніка ў 1762 г. У арганізацыі новай вытворчасці ў Свержані актыўны ўдзел прымалі мясцовыя майстры. Аднак кіраўніцтва ёй Радзівілы даручылі Ксаверыю Дамініку Гескаму – прыдворнаму мастаку Ганны Радзівіл і Міхаіла Казіміра Радзівіла Рыбанькі. Вядома, што, пачынаючы з 1733 г. і да самой смерці, ён працаваў у розных гарадах: Белай Падлясцы, Нясвіжы, Свержані, Гародні, Бярэсці, Алыцы, Слуцку. Дыяпазон яго творчасці надзвычай шырокі: ад станковых і манументальных жывапісных прац да тэатральных дэкарацый, графічных і дэкаратыўна-ўжытковых твораў. У многім такая ўніверсальнасць творчасці звязана з яго статусам прыдворнага мастака, які павінен быў рэалізоўваць розныя прыдворныя мастацкія праекты.

Пад яго кіраўніцтвам (красавік 1742 – восень 1744 г.) і пры непасрэдным удзеле, а таксама, напэўна, па яго эскізах быў наладжаны ў Свержані выпуск фаянсавых вырабаў для нясвіжскага эрэміторыя. Асартымент прадукцыі Свержанскай фаянсавай мануфактуры, якая спыніла працу каля 1764 г., падзяляўся на 4 асноўныя групы: сталовы і дэкаратыўны посуд, пластыка, санітарна-гігіенічная кераміка, пячная кафля. У галіне формаўтварэння майстры свержанскай мануфактуры арыентаваліся галоўным чынам на еўрапейскія ўзоры. Вазы, талеркі, салатніцы фармаваліся па ўзорах нямецкага фаянсу першай паловы XVIII ст. у стылі позняга барока.

У 1729 г. Радзівілы закупілі саксонскія габелены, а затым на іх аснове пачалі вытворчасць габеленаў у межах сваіх уладанняў з дапамогай Ксаверыя Дамініка Гескага. Мануфактура ў Карэлічах належыла М. К. Радзівілу. У 1752 г. ён пажадаў, каб яе майстрамі была выткана серыя габеленаў, якія б праслаўлялі подзвігі Радзівілаў у войнах з крыжакамі, татарамі, казакамі-паўстанцамі. Эскізы для іх былі выкананы Гескім. На іх аснове былі вытканы славутыя шпалеры ў габеленавай тэхніцы, якая з'яўляецца цудоўнымі помнікамі дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва Беларусі. Сюжэты і кампазіцыі для карэліцкіх карцін-шпалераў рабілі і дзеці Гескага, прыдворныя мастакі Юзаф і Рудольф, якім дапамагалі мясцовыя мастакі: Скажыцкі, а таксама Андрэй і Канстанцін, прозвішчы якіх да нас не дайшлі (І. У. Ганецкая, В. І. Жук, М. М. Яніцкая). Як бачна, дзейнасць нямецкіх майстроў на ману-фактурах Радзівілаў садзейнічала таксама станаўленню вытворчасці фаянса-вых вырабаў і габеленаў на Беларусі.